УДК 821.161.3-4

**І.А. Бажок**
(Гомель, Беларусь)

# ПРАБЛЕМНА-ТЭМАТЫЧНЫ ДЫЯПАЗОН СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЭСЭІСТЫКІ

*У артыкуле даследуюцца праблемна-тэматычныя аспекты сучаснай беларускай эсэістыкі. Выяўляюцца традыцыйныя даміннанты зместу айчыннага эсэ – гісторыя, менталітэт, традыцыі, значнасць культурна-гістарычных дзеячаў, філасофскія пытанні. Асэнсоўваюцца творы Л. Рублеўскай, А. Разанава, Я. Сіпакова, В. Акудовіча, Г. Марчука, В. Казько, А. Сямёнавай і інш.*

Праблемна-тэматычны дыяпазон сучаснай беларускай эсэістыкі абумоўлены спецыфікай жанру. У эсэ непасрэдна выяўляецца светапоглядная канцэпцыя аўтара. З маналагічнага характару эсэістычнага наратыва вынікае суб'ектыўнасць успрымання рэчаіснасці, якую ўмоўны рэцыпіент атрымлівае ад канкрэтнага аўтара. Даследчыкі эсэістыкі (Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына, Г. Кісліцына,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І. Шаўлякова і інш.) слушна падкрэсліваюць цікавасць сучасных эсэістаў менавіта да нацыянальнай праблематыкі. Даследчыца Г. Швец адзначае, што асноўная тэматыка ўкраінскай эсэістыкі – гэта “асэнсаванне асаблівасцяў украінскага менталітэту, нацыянальнай свядомасці, прычын трагічных момантаў гісторыі народа, паслядоўнасці ў развіцці нацыянальных арганізмаў” [3, с. 14], што ў сваю чаргу ўказвае на праблемна-тэматычную блізкасць эсэістычных твораў у беларускай і ўкраінскай літаратурах.

Звярнуўшыся да гісторыі развіцця беларускай эсэістыкі, мы вылучылі чатыры асноўныя тэматычныя дамінанты айчыннага эсэ. Беларускія пісьменнікі ў эсэістычных тэкстах асэнсоўваюць: сусветную і айчынную гісторыю (І. Абдзіраловіч, У. Жылка, У. Караткевіч, В. Казько, А. Бахарэвіч і інш.), менталітэт нацыі, традыцыі народа (І. Абдзіраловіч, Р. Барадулін, П. Васючэнка, А. Бацюкоў і інш.), значнасць культурна-гістарычных дзеячаў (Я. Брыль, Н. Гілевіч, Л. Галубовіч, А. Марціновіч, Г. Марчук, А. Сямёнава, І. Саверчанка і інш.), філасофскія пытанні (Суліма, А. Бабарэка, У. Жылка, Л. Рублеўская і інш.). Кожная з тэматычных дамінант эсэ – традыцыйная, гістарычна замацаваная, а ў творах адзначаных пісьменнікаў адметна выяўляецца праблема нацыянальнай самабытнасці.

Асноўная тэматыка твораў А. Пашкевіча “Сімъ побѣдиши” – падарожжа, мова, нацыянальныя атрыбуты. Аўтар звяртаецца да асэнсавання самабытных беларускіх каштоўнасцей, робячы іх цэнтрам спасціжэння рэчаіснасці.

Найбольш выразна асэнсаванне беларускай самабытнасці прадстаўлена ў філасофскай эсэістыцы. Асноўная ідэя інфарматыўных эсэ Л. Рублеўскай з кнігі “Шыпшына для пані” – захаванне нацыянальных каштоўнасцей (мовы, гісторыі, атрыбутаў). У цэнтры ўвагі аўтара – вобраз саду, алюзія да біблейскага раю, вяртанне да першавобраза. Сітуацыя разумення, але непрымання рэчаіснасці пазначана ўжо ў пачатку кнігі. Разважаючы над пытаннямі смерці, магчымасцямі тэатральнай сцэны і значэннем маскі, аўтар адзначае негатыўны ўплыў сучаснасці на гістарычныя працэсы, звязаныя з актуалізацыяй нацыянальных атрыбутаў. Перадапошняе эсэ з “садовага” цыкла прысвечана стыхіі вады. “Сад вады” раскрывае асноўную думку ўсіх твораў – адраджэнне і захаванне роднай зямлі.

Метафізічная эсэістыка з выразным праяўленнем уласнааўтарскай філасофіі пазнання чалавека і рэчаіснасці выявілася ў творчасці А. Разанава. Пісьменнік падкрэслівае важнасць асаблівага стаўлення да слова як моўнай адзінкі. Праблема нацыянальнай самабытнасці вырашаецца аўтарам праз асэнсаванне асобных паняццяў і прадметаў. А. Разанаў у сваіх творах праз вобразы пазнае чалавека, абагульняючы вопыт папярэднікаў. Метафізічнае апісанне рэчыўнага свету дазваляе аўтару ахарактарызаваць не толькі акаляючае жыццё, але і паказаць вытокі чалавечай натуры. Аўтар піша пра цеснае яднанне інтэлектуальнага і фізічнага жыцця, рух думкі і жыцця, слова і цела, падобныя да пераходу з адной якасці ў другую, з аднаго вымярэння ў іншае.

Праблема нацыянальнай самабытнасці ў гісторыка-сацыяльным аспекце раскрываецца ў кнізе Я. Сіпакова “Зялёны лісток на планеце зямля”. Пісьменнік падае гістарычныя звесткі пра нашу краіну, мову, грошы, людзей і інш. Некато-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рыя творы пачынаюцца кароткімі філасофскімі развагамі аўтара. Сучасную беларускую рэчаіснасць Я. Сіпакоў паказвае праз сувязь з мінулым, праз асабістае светаўспрыманне і агульначалавечае. С. Андраюк слушна заўважае, што “энцыклапедыя агульная (адносна гісторыі, геаграфіі, біялогіі, духоўнага жыцця) стала энцыклапедыяй асабістай” [1, с. 117–118].

На прыкладзе аўтабіяграфічнага эсэ У. Ліпскага “Мой май” раскрываецца лёс сучаснага беларуса, яго каштоўнасці, сямейныя ўзаемаадносіны і погляды на рэчаіснасць. У зборніку сучаснай аўтабіяграфічнай прозы “Выспы” Ф. Сіўко разважае над адвечнымі пытаннямі жыцця і смерці, аўтар піша пра гісторыю сваёй сям’і, распавядае пра стаўленне продкаў да смерці, пра існаванне культуры смерці, якая нашмат мацней, чым уяўляецца. Такім чынам, Ф. Сіўко рэпрэзентуе сучасны светапогляд беларуса праз аўтарскае самавыяўленне ў тэксце. Вобраз аднаго з тыпаў сучаснага чалавека апісаны аўтарам ў эсэ на сацыяльную тэматыку “Сволач паводле Брэма”, якое закранае праблемы дабра і зла, маралі. Эсэістычныя творы Ф. Сіўко заснаваныя на асабістым вопыце жыцця, на апавяданнях пра родныя яму мясцы, продкаў, мову.

Уласны погляд на сучасны нацыянальны менталітэт выказвае В. Акудовіч у кнігах “Мяне няма: роздумы на руінах чалавека”, “Разбурыць Парыж”, “Код адсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці” і інш. Творы адносяцца да філасофскай малафарматнай прозы і разглядаюць праблемы мовы, характару народа, гісторыі і ідэалогіі краіны.

Асноўная ідэя гістарычных твораў У. Арлова – гэта ідэя “беларускай Беларусі”. Нацыянальнае пытанне ў эсэ пісьменніка закранаецца вельмі часта і асэнсоўваецца ў гісторыка-культурным аспекце. “Незалежнасць – гэта...” – мастацкае эсэ пра палітыку, якое яскрава акрэслівае суб’ектыўную грамадзянскую пазіцыю аўтара па праблемах мовы, ідэалогіі, арміі, дзяржаўных меж, нацыянальных старажытных свят, гісторыі, культуры, чалавечай годнасці і інш. У эсэ У. Арлова ў цэнтры ўвагі – чалавек з яго самаадчуваннем у свеце падзей і абставін. У эсэ развіваецца праблема ідэнтычнасці. Эсэіст-метафізік Ігар Бабкоў у кнізе “Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнні ру[і]наў” (2005 г.) асвятляе розныя аспекты “беларускасці”.

Да гісторыка-біяграфічнай разнавіднасці эсэ адносяцца творы Г. Марчука пра рэжысёраў, з якімі быў знаёмы пісьменнік. Аўтар выкарыстоўвае форму ўспамінаў, каб адзначыць самыя яскравыя моманты ў жыцці героя, падкрэсліць спецыфіку яго характару. Такім чынам аўтар прадстаўляе своеасаблівую галерэю вобразаў сучасных творцаў, раскрывае іх характары.

У гістарычных эсэ В. Казько аб’ектам выступае абагулены вобраз чалавека-грамадзяніна, беларуса. У кнізе “Дзікае паляванне ліхалецця” аўтар разважае над праблемамі сучаснага грамадства і адзначае, што на кожнае новае пакаленне ў сувязі з тэхнічным прагрэсам прыпадае ўсё меней і меней часавай прасторы. Чалавек заўсёды знаходзіцца ў руху, і яму пагражае “азвярэнне”. Пісьменнік бачыць не толькі асобнага чалавека, але і мільярды жыццяў на планеце, у якіх “нехта нябачны” (падразумяваецца Бог) расчараваўся на сутыку тысячагоддзяў. Пісьменніка цікавяць праблемы творчасці, кніг, чытачоў, выдавецтваў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У мастацкай творчасці А. Сямёнавай вядучай з'яўляецца рэлігійная тэматыка. У кнізе "Таямніцы пакутны колер" (2004 г.) пісьменніца асэнсоўвае адвечныя тэмы жыцця і смерці, віны і пакаяння, пакутаў і збавення. Як зазначае сама аўтар, яна стварае эсэ "паводле таго, што чыталася, уяўлялася, перажывалася раней і ўрэшце з'явілася відавочна, малітоўна асэнсавалася ў Боскай рэальнасці і Праўдзе" [2, с. 17]. А. Сямёнава ўспрымае рэчаіснасць праз магчымасці, дадзеныя Богам. Эсэ з'яўляецца сродкам выяўлення аўтарскіх пачуццяў.

Адной са значных тэндэнцый у развіцці сучаснай беларускай эсэістыкі з'яўляецца зварот да тэмы кахання. У "Стомленасці Парыжам" Л. Дранько-Майсюка, у эсэ "Мой анёл паляцеў на неба" С. Дубаўца выяўляецца тэндэнцыя да раскрыцця інтымных пачуццяў і асабістых трагічных перажыванняў беларусаў.

Такім чынам, акрамя эсэістычных твораў, у якіх нацыянальная самабытнасць з'яўляецца вядучай тэматычнай дамінантай, у сучаснай беларускай літаратуры вылучаецца некалькі праблемна-тэматычных груп з рэпрэзентацыяй нацыянальнага: гістарычная, эсэ пра мастацтва, палітычная, філасофская, аўтабіяграфічная, інтымная.

**Спіс літаратуры**

1. Андраюк, С. Янка Сіпакоў і яго "Мая бібліятэка" / С. Андраюк // Полымя. – 2013. – № 8. – С. 116–127.

2. Сямёнава, А. Таямніцы пакутны колер : Эсэ. Апавяданні / А. Сямёнава. – Мінск : Про Хрыста, 2004. – 104 с.

3. Швець, Г. Ессеїстика Василя Барки: жанрова специфіка та проблематика : автореф. дис. … канд. філол. наук : 10.01.01 / Г. Швець ; Київ. нац. ун-т ім. Т. Шевченка. – Кіїв, 2006. – 21 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова